# ПЕРАМОЖНАМУ МАЮ – РАДКІ ПАЭТА-ЗЕМЛЯКА

**Ваўкавыскі раён. 9 мая ў аграгарадку Вярэйкі выступіў член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Віктар Курловіч.**

Беларусь па традыцыі з размахам адзначыла самае дарагое свята – Дзень Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Няма такой сям'і ў нашай рэспубліцы, дзе не чулі б адгалоскаў ваеннага ліхалецця. Кожны трэці жыхар Беларусі стаў ахвярай фашызму. Таму свята Перамогі для ўсіх нас – са слязамі на вачах. Не застаўся абыякавым і безуважным да 9 мая ні адзін населены пункт, ні адзін нават маленькі куток сінявокай Беларусі.

9 мая 2024 года на пляцоўцы Дома культуры аграгарадка Вярэйкі (Ваўкавыскі раён) адбыўся святочны канцэрт пад назвай «Пераможнаму маю прысвячаецца». У выкананні прадстаўнікоў розных пакаленняў па-святочнаму гучна, выразна і ў той жа час шчымліва гучалі мастацкія творы на тэму Вялікай Айчыннай вайны і перамогі ў ёй гераічнага, шматнацыянальнага савецкага народа. У праграме канцэрта прыняў удзел член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт-зямляк Віктар Курловіч.

Віктар Георгіевіч *(на фота)* сардэчна павіншаваў аднавяскоўцаў з гэтым свяшчэнным святам і прадэкламаваў некалькі аўтарскіх твораў. Гэта былі радкі, прысвечаныя пераможнаму маю 1945-га і тым, хто, не шкадуючы ўласнага жыцця, абараняў Радзіму, адстойваў на палях смяротных баёў з фашыстамі нашу магчымасць сёння жыць, працаваць, гадаваць дзяцей пад мірным небам.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** «Пераможнаму маю прысвячаецца» – пад такой назвай у аграгарадку Вярэйкі (Ваўкавыскі раён, Гродзенская вобласць) 9 мая 2024 года адбыўся святочны канцэрт, прысвечаны Дню Перамогі. Сярод удзельнікаў мерапрыемства – член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт Віктар Курловіч.


«Вярэйкаўскі Дом культуры»
ФИЛИАЛ
«Верейковский Дом культуры»




ФІЛІЯЛ
«Вярэйкаўскі Дом культуры»
ФИЛИАЛ
«Верейковский Дом культуры»